# У 2026 годзе спаўняецца:

**685 гадоў** г.Ашмяны (1341).
**565 гадоў** з часу смерці Соф'і Гальшанскай (1405–1461).
**150 гадоў** Царква Святога Іллі-Прарока (1876) в.Міхайлоўшчына.
**145 гадоў** РУП "Ашмянскі дражджавы завод" (1881).
**130 гадоў** ААТ "Гальшанскі крухмальны завод" (1896).
**125 гадоў** Свята-Георгіеўская царква (1901) в.Гальшаны.
**120 гадоў** Касцёл Святога Міхаіла Архангела (1906) г.Ашмяны.
**120 гадоў** Аўдзееў Аляксандр Мікалаевіч (1906–1941), лётчык, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Загінуў у паветраным баі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў першыя дні вайны пад Ашмянамі.
**120 гадоў** Лабаты Макар Аляксандравіч(1906–1982), першы рэдактар газеты «Знамя свободы».
**90 гадоў** Дзяржаўная ўстанова адукацы "Жупранская сярэдняя школа імя Ф.К. Багушэвіча" (1936).
**90 гадоў** Гіруць Мечыслаў Іванавіч (1936), палітычны, дзяржаўны і гаспадарчы дзеяч. Нарадзіўся ў 1936 г. у в.Скілондзішкі Ашмянскага раёна.
**75 гадоў** Дзяржаўная ўстанова адукацы "Ашмянская дзіцячая школа мастацтваў" (1951).
**75 гадоў** Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сярэдняя школа №2 г.Ашмяны" (1951).
**65 гадоў** 60 гадоў Ашмянскі філіял камунальнага ўнітарнага прадпрыемства па забеспячэнню палівам "Гроднааблпаліва" (1961).
**65 гадоў** Гальшанскае лясніцтва Дзяржаўнай лесагаспадарчай установы "Смаргонскі вопытны лясгас" (1961).
**60 гадоў** Ашмянская раённая арганізацыйная структура ДТСААФ (1966).

***Студзень***

**90 гадоў** 03.01.1936 г. **Шумская Галіна Іванаўна** (1936), Заслужаны настаўнік Беларусі, педагог.
**100 гадоў** 07.01.1926 г. **Арцем'ева Зінаіда Яфімаўна** (1926–2011), Заслужаны настаўнік Беларусі, педагог.
**65 гадоў** 13.01.1961 г. **Лосева (Балкоўская) Рэгіна Станіславаўна** (1961), майстар спорту па лыжных гонках (1980), майстар спорту міжнароднага класа па спартыўнай хадзьбе (1982), кандыдат у майстры спорту па лёгкай атлетыцы (крос), па біятлоне. Нарадзілася у в.Лэйлубка Ашмянскага раёна.
**90 гадоў** 21.01.1936 г. **Розенберг Мікалай Рыгоравіч** (1936–2022), самадзейны кампазітар, музыкант, педагог.

*Люты*

**135 гадоў** 7.02.1891 г. (26.01 па старым стылі) **Міцкевіч (Каменская) Марыя Дзмітраўна** (1891–1945), настаўніца, жонка Якуба Коласа. Нарадзілася у Ашмянах у сям'і псаломшчыка Ашмянскай Васкрасенскай царквы Дзмітрыя Іванавіча і Марыі Цімафееўны Каменскіх.

**220 гадоў** 13.02.1806 г. **Корсак Юльян** (1806–1855), паэт, перакладчык. Нарадзіўся у г.Слонім, вучыўся ў базыльянскай школе ў Барунах Ашмянскага павета.

**115 гадоў** 23.02.1911 г. **Манохін Віктар Аляксандравіч** (1911–1972), дзяржаўны і грамадскі дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, камандзір партызанскай брыгады імя Гастэлы, якая дыслацыравалася і дзейнічала ў Ашмянскім раёне.

*Сакавік*

**75 гадоў** 04.03.1951 г. **Каркотка Леанід Міхайлавіч** (1951–2009), самадзейны паэт, педагог. Працаваў у школе-інтэрнаце г. Ашмяны, 35 гадоў выкладаў беларускую мову і літаратуру.

**105 гадоў** 25.03.1921 г**.** **Кадолка Антон Аляксандравіч** (1921–2012), Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны (2006), ардэнаносец, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

*Красавік*

**50 гадоў** 19.04.1976 г. **Балыш Андрэй Мікалаевіч** (1976**),** кандыдат гістарычных навук (2003), дацэнт. Нарадзіўся у г.Ашмяныг. Закончыў з адзнакай СШ №2 (1993), Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы (гістарычны факультэт, 1998), аспірантуру Маскоўскага авіяцыйнага інстытута (МАІ) (2002). Працаваў настаўнікам гісторыі ў Гальшанскай СШ Ашмянскага раёна, выкладчыкам гісторыі ў МАІ. Апошнія 6 гадоў сумяшчае працу ў МАІ з выкладаннем у Маскоўскім дзяржаўным тэхнічным універсітэце імя М. Э. Баўмана (МДТУ імя Баўмана).

**100 гадоў** 26.04.1926 г. **Навумаў Іван Цімафеевіч** (1926–2011), Ганаровы грамадзянін горада Ашмяны (2006), ваеннаслужачы, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

**60 гадоў** 27.05.1966 г. **Спірыдовіч Ігар Вікенцьевіч** (1966), самадзейны паэт, калекцыянер. Жыве ў в.Мардасы Ашмянскага раёна.

*Чэрвень*

**75 гадоў** 12.06.1951 г. **Верамейчык Ларыса Антонаўна** (1951), вучоны-аграхімік, доктар сельскагаспадарчых навук (2009), прафесар (2009). Нарадзілася у г. Ашмяны. Скончыла Беларускую дзяржаўную сельскагаспадарчую акадэмію (1973). У 1973-1981 гг. працавала інжынерам-глебазнаўцам у Беларускім лесаўпарадкавальным прадпрыемстве, у 1984-1986 гг. – у БелНДІ глебазнаўства і аграхіміі, у 1986-2010 гг. - у Беларускім

дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце. З 2010 – прафесар кафедры эканомікі прадпрыемстваў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

**85 гадоў** 22.06.1941 г. **Вішнеўская Тамара Сямёнаўна** (1941), передавік сельскагаспадарчай вытворчасці, ардэнаносец. З 1963 г. па 1987 г. галоўны аграном калгаса імя Багушэвіча, з 1982 г. па 1999 г. старшыня Жупранскага сельсавета.

**100 гадоў** 23.06.1926 г. **Мягкова Таццяна Сцяпанаўна** (1926–2021), Ганаровы грамадзянін г.Ашмяны (2021), ветэран Вялікай Айчыннай вайны, удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі.

**100 гадоў** 24.06.1926 г. **Каляда Ганна Мікалаеўна** (1926–2007), бібліятэкар, передавік сацыяльна-культурнай сферы Гродзеншчыны. У 1964-1981 гг. – дырэктар Ашмянскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.

***Ліпень***

**85 гадоў** 09.07.1941 г. Лабуніна Валянціна Сцяпанаўна (1941), краязнавец, бібліятэкар, фотааматар, грамадскі дзеяч. У 1969–2003 гг. – загадчык Гальшанскай дзіцячай бібліятэкі. Сярод шматлікіх узнагарод – Ганаровы знак Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь “За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры” (2000).

**55 гадоў** 11.07.1971 г. **Шэмет Сяргей Лявонавіч** (1971), мастак, член Беларускага саюза мастакоў. Нарадзіўся ў г. Ашмяны.

**130 гадоў** 23.07.1896 г. **Валынчык Антон Міхайлавіч** (1896–1985), беларускі хормайстар, педагог, кампазітар, заслужаны дзеяч культуры Беларусі (1964). Нарадзіўся у в.Мяльканавічы Слонімскага раёна. У 1947–1949 гг. працаваў мастацкім кіраўніком Беларускага міжабласнога ансамбля песні і танца ў Ашмянах. Апрацоўваў беларускія народныя песні. Пісаў і рыхтаваў для выканання свае песні і хоры на словы Я.Купалы, Я.Коласа, А.Русака, П.Броўкі.

***Жнівень***

**115 гадоў** 13.08.1911 г. **Склубоўскі Вікенцій (Вінцэнт) Аляксандравіч** (1911–2002), палітычны і грамадскі дзеяч, удзельнік беларускага і польскага прагрэсіўнага руху Заходняй Беларусі, юрыст. Нарадзіўся ў в.Малышкаўшчына Ашмянскага раёна.

**75 гадоў** 15.08.1951 г. **Шкелда Алена Адольфаўна** (1951), бібліятэкар, лаўрэат прэміі імя А.І.Дубко Гродзенскага аблвыканкама “За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва” у намінацыі “Бібліятэкар года” (2006). З 1971 г. працуе ў сельскай бібліятэцы аг.Кальчуны.

**100 гадоў** 16.08.1926 г. **Цітко Раіса Іванаўна** (1926–1977), Герой Сацыялістычнай Працы (1971), передавік сельскагаспадарчай вытворчасці. Нарадзілася у в.Юраўляны (на Беласточчыне). З 1952 г. па 1974 г. працавала

свінаркай у саўгасе “Перамога” (зараз КСУП “Кракоўка”) Ашмянскага раёна. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1971) і Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966),

**95 гадоў** 25.08.1931 г. **Нацэўскі Георгій Канстанцінавіч** (1931–2003), Заслужаны настаўнік Беларусі, педагог. У 1955–1991 гг. працаваў выкладчыкам у Ашмянскім сельскагаспадарчым тэхнікуме.

***Верасень***

**60 гадоў** 25.09.1966 г. **Муха Святлана Анатольеўна** (1966), самадзейны паэт, педагог. Нарадзілася у г.Ашмяны. На працягу 19 гадоў працавала ў школе для глухіх дзяцей. Паэзіяй захапляецца з юнацтва.

***Кастрычнік***

**115 гадоў** 28.10.1911 г. **Тубеліс Уладзімір Іванавіч** (1911–1955), дзяржаўны і партыйны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Нарадзіўся у г.Віцебск у сям’і рабочага. У маі 1942 г. – камісар партызанскай брыгады імя Гастэлы, якая кантралявала тэрыторыю Ашмянскага раёна. Адначасова з’яўляўся сакратаром падпольнага Ашмянскага РК КПБ. У 1944–1949 гг. – сакратар Ашмянскага РК КПБ. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1947–1951).

***Лістапад***

**70 гадоў** 05.11.1956 г. **Юрша Васіль Адамавіч** (1956), краязнавец, паэт, калекцыянер. Нарадзіўся у г.Ашмяны. У 1979 г. закончыў Мінскі радыё-тэхнічны інстытут па прафесіі інжынер-сістэматэхнік. Пісаць вершы пачаў у пачатку 2000-х гадоў.

**80 гадоў** 06.11.1946 г. **Шакола Пётр Валяр’янавіч** (1946–2018), паэт, краязнавец, педагог. Нарадзіўся у г.Ашмяны. У 1970-1985 гг. займаў розныя службовыя пасады ў дзяржаўных, партыйных і сельскагаспадарчых органах. З 1985 г. працаваў выкладчыкам у школах Ашмянскага раёна. Пісаць вершы пачаў амаль што з дзяцінства. Але асаблівага плёну творчасць паэта дасягнула ў сталым узросце.

**70 гадоў** 14.11.1956 г. **Даўляшэвіч Уладзімір Сцяпанавіч** (1956), майстар спорту СССР па матацыклетным спорце (1981). Нарадзіўся ў г.Ашмяны. Трэнер па мотаспорце ў Мінскай федэрацыі аўтамотаспорту. Шасціразовы чэмпіён Беларусі, заняў 5-е месца на чэмпіянаце СССР (Кішынёў, 1983). Падрыхтаваў майстроў спорту А.І.Гіруця, С.М.Квяткевіча.

**65 гадоў** 18.11.1961 г. **Гарлуковіч Сяргей Вадзімавіч** (1961), беларускі і расійскі спартсмен (футбол). Нарадзіўся у в.Баруны. Выступаў за каманды “Гомсельмаш” (Гомель), “Дынама” (Мінск), “Лакаматыў”, “Спартак” (Масква), “Спартак-Аланія” (Уладзікаўказ), германскіх “Барусія” (Дортмунд і “Баер”). Чэмпіён XXIУ Алімпійскіх гульняў (1988, Сеул), чэмпіён Расіі (1996, 1997), уладальнік Кубка Расіі (1998). Выступаў за зборныя СССР (правёў 21

гульню), Расіі (17 гульняў). Пасля завяршэння гульнявой кар'еры – футбольны трэнер.

**100 гадоў** 23.11.2026 г. **Лясны Уладлен Фядотавіч** (1926–2014). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, капітан, 1-ы Украінскі фронт (1944–1945). Загадчык аддзела культуры Ашмянскага РВК (красавік 1957 – жнівень 1975).

***Снежань***

**220 гадоў** Нарадзіўся ў снежні 1806 г. **Карчэўскі Юльян Юзафавіч** (1806–1833), беларускі мастак. Нарадзіўся на Ашмяншчыне. Пісаў пераважна жанравыя кампазіцыі. Быў знаёмы з А.Міцкевічам. Карціны Карчэўскага падабаліся дасканаласцю каларыта, закончанасцю і дакладным прытрымліваннем натуры.

**70 гадоў** 10.12.1956 г. **Балінская Галіна Іванаўна** (1956), перадавік сацыяльна-культурнай сферы, культработнік. Нарадзілася у в.Васюкі Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1997–2015 гг. – загадчык аддзела культуры Ашмянскага РВК, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ашмянскага РВК. Сярод шматлікіх узнагарод – нагрудны Знак Міністэрства культуры Беларусі (2013).

Складальнік Г.У.Палубінская